# ГАРАДОЦКАЯ АПЕРАЦЫЯ
# (13–31 СНЕЖНЯ 1943)

Гарадоцкая аперацыя (13–31 снежня 1943), наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Прыбалтыйскага фронту (генерал арміі І. Х. Баграмян) у раёне Гарадка Віцебскай вобласці.

Удзельнічалі 11-я гвардзейская (генерал-лейтэнант К. М. Галіцкі), часці 4-й ударнай (генерал-лейтэнант В. І. Швяцоў), 43-й (генерал-лейтэнант К. Дз. Голубеў), 3-й паветранай (генерал-лейтэнант М. П. Папівін) армій, 1-ы, 5-ы танкавыя і 3-і гвардзейскія кавалерыйскія карпусы. Планавалася сустрэчнымі ўдарамі 11-й гвардзейскай і 4-й ударнай армій у напрамку ст. Бычыха разграміць гарадоцкую групоўку праціўніка, ліквідаваць плацдарм ворага, т. зв. Гарадоцкі выступ, авалодаць Гарадком і наступаць у напрамку Віцебска.

Гарадоцкі выступ абаранялі нямецкія войскі 3-й танкавай арміі групы армій «Цэнтр» і паўднёвага крыла 16-й арміі групы армій «Поўнач». Каб не дапусціць прарыву фронту і злучэння савецкіх войск з беларускімі партызанамі, нямецкае камандаванне перакінула сюды 2 пяхотныя дывізіі з-пад Ленінграда, 5 пяхотных і 1 танкавую дывізіі з паўднёвага крыла групы армій «Цэнтр».

13 снежня 11-я гвардзейская і 4-я ўдарная арміі пры падтрымцы танкаў і артылерыі пачалі штурм варожых пазіцый. Войскі 4-й ударнай арміі прарвалі галоўную паласу абароны праціўніка. У паласе наступлення 11-й гвардз. арміі, якая наносіла галоўны ўдар, праціўнік аказаў упартае супраціўленне, і толькі нязначныя сілы здолелі ўклініцца ў яго абарону. 14 снежня на правым флангу 11-й гвардзейскай арміі ўведзены ў бітву 1-ы танкавы корпус і 83-я гвардзейская стралковая дывізія. 16 снежня 1-ы танкавы корпус выйшаў у раён ст. Бычыха, дзе злучыўся з 5-м танкавым корпусам 4-й ударнай арміі.

Да 20 снежня вызвалена больш за 500 населеных пунктаў. 24 снежня войскі 11-й гвардзейскай арміі авалодалі Гарадком.

У выніку Гарадоцкай аперацыі войскі фронту прасунуліся на 60 км, разграмілі 6 пяхотных і 1 танкавую дывізію праціўніка, ліквідавалі Гарадоцкі выступ, перарэзалі чыгунку Полацк – Віцебск. Былі створаны ўмовы для наступлення ў раёне Віцебска. 12 часцям і злучэнням, якія вызначыліся ў аперацыі, нададзены ганаровыя найменні «Гарадоцкіх».

Загадам ВГК прысвоена найменне Гарадоцкіх: 5-й гвардзейскай стралковай дывізіі, 11-й гвардзейскай стралковай дывізіі, 26-й гвардзейскай стралковай дывізіі, 10-й гвардзейскай танкавай брыгадзе, 17-й знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгадзе (палкоўнік Нялепа Васіль Паўлавіч), 488-му гарматнаму артылерыйскаму палку (палкоўнік Штульберг Мацвей Якаўлевіч), 523-му корпуснаму артылерыйскаму палку (палкоўнік Торапаў Павел Ягоравіч), 2-й гвардзейскай мінамётнай дывізіі (палкоўнік Апрэлкін Іван Аляксандравіч), 545-му мінамётнаму палку (падпалкоўнік Смірноў Антон Пятровіч), 6-му гвардзейскаму матарызаванаму інжынернаму батальёну (маёр Яўграфаў Аляксей Іванавіч), 259-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі (палкоўнік Курбатаў Якаў Архіпавіч).

Войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Гарадка, загадам ВГК ад 24 снежня 1943 г. аб'яўлена падзяка і ў Маскве дадзены салют 12 атрылерыйскімі залпамі з 124 арудзій.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Баграмян, И. Х.** Командую фронтом / И. Х. Баграмян // Так мы шли к победе / И. Х. Баграмян. – М. : Воениздат, 1988. – С. 424–440.

2. **Беларусь** у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1990. – С. 153.

3. **Волков, А. И.** Бои перед Витебском / А. И. Волков // 43-я в боях и сражениях / А. И. Волков. – М. : Фонд им. И. Д.Сытина, 1996. – С. 128–143.

4. **Галіцкі, К. М.** Гарадоцкая аперацыя 1943 / К. М. Галіцкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1994. – Т. 2. – С. 479.

5. **Кочетков, А.** Освобождение Бычихи / А. Кочетков // Гарадоцкі веснік. – 2006. – 6 мая. – С. 2.

6. **Позднин, М. С.** Городокская операция 1-го Прибалтийского фронта ; М.С. Позднин ; подготовил О. Мешков // Гарадоцкі веснік. – 2006. – 23 снеж. – С. 2.

7. **Свердлов, Ф.** Подготовка и ведение Городокской операции / Ф. Свердлов // Военно-исторический журнал. – 1976. – № 3. – С. 22–31.

8. **Хроника** Городокской операции [по материалам мемуаров командующего 11-й гвардейской армии генерал-полковника К. Н. Галицкого] // Гарадоцкі веснік. – 2013. – 24 снеж. – С. 4, 5.

9. **Шевченко, Н.** По колено в грязи, по горло в крови... : 13 декабря 1943 года началась Городокская наступательная операция / Н. Шевченко // Белорусская нива. – 2013. – 13 дек. – С. 14–15.